# Згуртоўвацца вакол ідэй і мэт перабудовы

## Я. Я. Сакалоў у рэдакцыі «Звязды»

**Як паведамлялася, адбылася сустрэча першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі з журналістамі «Звязды».**

**У ёй таксама прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ А. С. Камай, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, старшыня Дзяржплана БССР В. Ф. Кебіч, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ: арганізацыйна-партыйнай і кадравай работы — В. І. Борыс, ідэалагічнага—А. У. Русецкі, іншыя адказныя работнікі апарату ЦК КПБ.**

**Сёння мы друкуем справаздачу з гэтай сустрэчы.**

Галоўнай тэмай жывой, зацікаўленай размовы ў рэдакцыі было абмеркаванне шляхоў павышэння эфектыўнасці публікацый «Звязды» ў сённяшні складаны час перабудовы. Значны рост тыражу газеты расцэньваўся як рост аўтарытэту партыйнага выдання.

Аднак рэдакцыйная калегія, партыйнае бюро зусім не лічаць, адзначыў рэдактар газеты У. Б. Наркевіч, што газета поўнасцю адпавядае тым высокім патрабаванням, якія сёння прад'яўляюцца партыяй да прэсы. Трэба самакрытычна прызнаць, што рэдакцыі не ўдалося спаўна выкарыстаць усе тыя спрыяльныя магчымасці, якія адкрыла перабудова. «Звязда» не здолела пакуль выйсці на высокі ўзровень партыйнай патрабавальнасці пры распрацоўцы тых або іншых праблем нашага грамадства як у сферы палітыкі і ідэалогіі, так і ў сферы эканомікі.

...тыйныя работнікі, вінаваты і работнікі друку, адзначыў Я. Я. Сакалоў. Хібы ў рабоце пэўнага кіраўніка партыйнага камітэта чамусьці часта пераносіліся і пераносяцца дагэтуль на ўсю партыю. Гэтым займаюцца нават людзі даволі падрыхтаваныя і з добрым жыццёвым вопытам. Успомніце, што было пасля вайны. Калі гэта вёсачка — то адны печы і тыя без комінаў. Калі горад, то адны шкілеты дамоў. Хто ўсё гэта адрадзіў, аднавіў, пабудаваў? Гэта зрабілі нашы старэйшыя таварышы разам з камуністамі, разам з партыяй і пад яе кіраўніцтвам. Бо ў нас не было і няма іншай сілы, якая аб'ядноўвала б, клікала б наперад. І ніхто іншы, як партыя, распачала перабудову.

Планы і намеры ў рэдакцыі добрыя, адзначыў першы сакратар ЦК КПБ. Калі журналісты возьмуцца працаваць імена ў гэтым напрамку, то яны...

...публікі. Цяпер стаіць праблема вывазу і харчовых тавараў. Як паказаў аналіз, увесь рост заработнай платы ў рэспубліцы летась пайшоў на ашчадныя кніжкі, а тавараабарот вырас за кошт прывазных грошай, гэта значыць за кошт вывазу тавараў. І якой бы складанай ні была гэта праблема, яе трэба, безумоўна, вырашаць.

Што ж датычыць скарачэння кіраўніцкага апарату, то ў «Звяздзе» добра паказана, як можна «перапампоўваць» яго з аднаго месца ў другое. Цяпер ён расце на прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія перайшлі на гасразлік. У першым квартале гэтага года камісія па ўдасканаленню кіравання народнай гаспадаркай унясе прапановы ў Савет Міністраў аб змяненні платы за працоўныя рэсурсы. Прыём на работу кожнага новага работніка апарату кіравання будзе каштаваць тысячы рублёў. Такім чынам, мяркуецца вырашыць гэту праблему не адміністрацыйна-каманднымі рычагамі, а эканамічнымі метадамі.

Загадчык аддзела пісьмаў і масавай работы рэдакцыі Д. М. Новікаў выказаў меркаванне, што ўсе партыйныя камітэты павінны браць крытычныя матэрыялы прэ...

...шым развіцці сістэмы інфармавання работнікаў прэсы, аб павышэнні эфектыўнасці прэс-канферэнцый, якія апошнім часам праводзяцца ў Рэспубліканскім прэс-цэнтры, арганізаваным па рашэнню Бюро ЦК КПБ.

Як паведаміў А. С. Камай, пасля кожнага пленума ЦК КПБ ці пасяджэння Бюро ЦК, дзе будуць разгледжаны буйныя пытанні, плануюцца сустрэчы з журналістамі. Пачатак гэтаму пакладзены.

Сакратар партыйнага бюро рэдакцыі Я. М. Чапля, у прыватнасці, гаварыў аб даручэннях надрукаваць той ці іншы артыкул, які, на думку рэдкалегіі, носіць часам спрэчны характар. Ён выказаў пажаданне больш прыслухоўвацца да думкі журналістаў.

І журналістам не трэба сябе пераацэньваць, адзначыў Я. Я. Сакалоў. Узаемаразуменне павінна будавацца на прынцыповай, але таварыскай аснове. Нельга проціпастаўляць журналістаў і партыйных работнікаў. Гэта не на карысць справе. Думаецца, трэба ўзняць статус рэдактараў газет, павысіць ролю рэдакцыйных калегій. Гэта будзе садзейнічаць росту аўтарытэту прэсы, яе...

Рэдкалегія і партбюро выйшлі з прапановай аб стварэнні ў рэдакцыі новага аддзела—экалогіі і ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Рэдакцыя таксама лічыць неабходнай арганізацыю спецвыпуску «Звязда» на ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС». Арганізаваць яго можна з дапамогай адпаведнай камісіі Бюро ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР. Рэдакцыя спецвыпуску магла б размясціцца ў Гомелі, а газета—выдавацца для жыхароў Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай і Мінскай абласцей.

Адказны сакратар рэдакцыі У. У. Андрыевіч, які асвятляў работу II З'езда народных дэпутатаў, пацікавіўся ў Я. Я. Сакалова, чаму спатрэбіўся зварот народных дэпутатаў ад Беларусі да Старшыні Вярхоўнага Савета СССР па пытаннях чарнобыльскай аварыі.

Пастаўлена задача ўсімі сродкамі паскорыць вырашэнне пытанняў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў аварыі, адказаў першы сакратар ЦК КПБ. Галоўная задача — пабудаваць новыя аграгарадкі і перасяліць туды людзей. Мы на З'ездзе сур'ёзна ўзнялі пытанне аб зацвярджэнні праграмы, прыня...

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы